УДК 32.001

# ПАДРУЧНІК СУПРАЦЬ ХРЭСТАМАТЫІ: НАСТУПСТВЫ ЗДАРОВАЙ ЭКАНОМІІ

**Галубовіч В.У.**
УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт"
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Адной з перадумоваў эфектыўнага засваення студэнтамі асноваў ведаў па палітычнай навуцы з'яўляецца праца з арыгінальнымі тэкстамі "класікаў" палітычнай думкі. На сённяшні дзень шэраг праблемаў, звязаных з забеспячэннем тэкстамі, сапраўды, зняты, паколькі рэгулярна выдаюцца і перавыдаюцца практыкумы па паліталогіі, акрамя таго, найбольш папулярныя ў гісторыі палітычнай думкі працы ёсць, бадай, у кожнай бібліятэцы і даступныя ў інтэрнэце. Больш складана знайсці працы палітолагаў XX - пач. XXI стст. Выклікана гэта тым, што калі яны і перакладаюцца на даступную для студэнтаў расійскую мову, то звычайна не трапляюць у беларускія бібліятэкі і пазнаёміцца з імі можна толькі пры ўмове спецыяльнага пошуку. Апошняе вымагае пэўнага часу, якога, на жаль, няма для таго, каб даводзіць вывучэнне паліталогіі ў вышэйшай школе да грунтоўнага навуковага асэнсавання. На сённяшні дзень склалася, несумненна, парадаксальная сітуацыя, калі магчымасці для працы з арыгінальнымі творамі ёсць, аднак часу для гэтага амаль няма.

Вывучэнне кожнай новай дысцыпліны прынята пачынаць з гісторыі навукі. Для прыродазнаўчых навук гэтая веда з'яўляецца толькі ўступам, а для шэрагу гуманітарных навук працы старажытных аўтараў ніколі не страчваюць актуальнасць. Адбітак іх творчасці лунае па-над сучаснасцю. Сутнасць чалавека, як вядома, не змяняецца ўжо многія тысячагоддзі, а ўласцівыя яму хібы і непрывабныя схільнасці знікнуць, відаць, толькі з самім чалавецтвам. Палітычная навука таксама мае сваіх "атлантаў", азнаямленне з тэкстамі якіх з'ўляёцца пачаткам шляху да асэнсавання палітычнай сферы жыцця. Напэўна, дзіўным выглядала б вывучэнне паліталогіі без працы з тэкстамі Арыстоцеля, Міколы Макіявелі, Карла Попера ці Ганны Арэнд. Але, здаецца, менавіта ў такім кірунку вымушаны рухацца выкладчыкі паліталогіі.

Традыцыйная ўніверсітэцкая мадэль навучання прадугледжвае, па-першае, тэарэтычную частку ў лекцыйнай форме, па-другое, практычную, якая адбываецца на семінарскіх занятках. На жаль, практыка у большасці выпадкаў зводзіцца да карэкцыі таго, што студэнт зразумеў на лекцыі і падчас самастойнай падрыхтоўкі. Але засваення адных схем і тэрміналогіі звычайна недастаткова для грунтоўнага авалодання ведамі, тым больш іх практычнага ўжывання. Таму на практычных занятках вялікую эўрыстычную ролю адыгрывае непасрэднае знаёмства з творамі, якія ўвайшлі залатую скарбонку палітычнай думкі. Падручнік на семінары ўступае ў канфлікт з самой сутнасцю практычнага занятка, на якім студэнт павінен вучыцца здабываць новую інфармацыю і яе аналізаваць. Такі падыход патрабуе наяўнасці не толькі адпаведных метадычных матэрыялаў (хрэстаматый), але і большага аўдыторнага часу. Праца з "першакрыніцамі" заўсёды выклікае больш



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

складанасцяў і ў імгненне “спальвае” час, якога застаецца з кожным годам усё менш. І ўсё менш магчымасцяў атрымлівае беларускі студэнт для таго, каб дакрануцца да лепшых дасягненняў чалавечай думкі, якімі прыходзіцца ахвяраваць дзеля пяці гадзінаў практыкі па паліталогіі.

Парадокс сучаснасці заключаецца ў тым, што самая галоўная задача дзяржавы – фарміраванне грамадзянскай самасвядомасці – можа застацца выкананай толькі часткова. Веды ў галіне палітычнай навукі атрымліваюць пераважна навучэнцы ВНУ, а праз скарачэнне аб’ёму выкладання паліталогіі, і гэта група нашага грамадства непазбежна будзе мець фрагментаванае ўяўленне пра прыроду палітычных інстытутаў і працэсаў.

УДК 378:635.9

## ВЫКАРЫСТАННЕ КАЛЕКЦЫЙ БАТАНІЧНАГА САДУ Ў АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ БДСГА

**Гардзеева Г.П., Сачыўка Т.У.**
Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія
г. Горкі, Рэспубліка Беларусь

Ва ўсіх краінах свету батанічныя сады вырашаюць тры асноўныя задачы:

– збіранне і захоўванне калекцый жывых раслін, захаванне генафонду;

– навукова-даследчая работа па вывучэнню новых раслін, якая накіравана на ўзбагачэнне культурнай флоры рэгіёна;

– адукацыйная і эколага-асветніцкая дзейнасць.

Батанічны сад БДСГА з’яўляецца структурнай адзінкай акадэміі, якая забяспечвае фарміраванне і захаванне задакументаванай калекцыі жывых раслін, якая, у сваю чаргу, выкарыстоўваецца ў адукацыйных і навуковых мэтах.

Батанічны сад, які заснаваны ў 1847 г., займае каля 20 га, у тым ліку аранжарэйны комплекс і дэндралагічны парк (11,8 га). У Батанічным садзе сабраны больш за 2000 відаў, форм і гатункаў: 350 – трапічных і субтрапічных 560 – дэкаратыўных дрэў і хмызнякоў адкрытага грунту, 1193 – дэкаратыўных травяністых, 120 – лекавых, 58 – востраараматычных, 17 – рэдкіх і знікаючых з флоры Беларусі [1, 3].

Супрацоўнікамі Батанічнага саду вядзецца плённая навуковая дзейнасць па захаванню знікаючых відаў раслін. З гэтай мэтай створана калекцыя раслін, якія знаходзяцца ў Чырвонай кнізе Рэспублікі Беларусь. Для захавання генафонду прадстаўнікоў розных знікаючых відаў расліны вырошчваюць для атрымання насення і саджанцаў для іх далейшага распаўсюджвання ў спрыяльных для гэтых раслін кліматычных зонах.

Калекцыя рэдкіх і знікаючых раслін выкарыстоўваецца супрацоўнікамі і выкладчыкамі акадэміі для надання ўвагі да гэтай флоры. На дадзены момант спіс раслін, якія належаць да аховы на Беларусі, уключае 274 віды: 173 – сасудзістыя расліны, 27 – мохавыя, 21 – водасці, 24 – лішайнікі, 29 – грыбы [2].

Студэнты аграэкалагічнага і агранамічнага факультэтаў праходзяць летнюю вучэбна-палявую практыку ў Батанічным садзе, падчас якой рэалізуецца праграма па ўсіх традыцыйных пытаннях батанікі, анатоміі,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ